# Прыметнік

**132.** Прачытайце тэкст. Ці зразумела з яго, як выглядае божая кароўка?



Па сцяблінцы рамонка паўзла ... **кароўка**. Якая **яна** ...! **Вусікі** ў кароўкі ... . Сама **яна** ..., як сунічка. На крыльцах у жучка шэсць ... **кропачак**.

Словы для даведкі: *прыгожая, божая, кароткія, чырвоная, чорных.*

Дапоўніце тэкст патрэбнымі словамі, каб атрымалася апісанне божай кароўкі.

Спішыце тэкст, устаўляючы патрэбныя словы. Вусна пастаўце да іх пытанні ад выдзеленых слоў.

**133.** Пазнайце прадметы па апісанні. Дапішыце ў спалучэнні слоў патрэбныя назоўнікі.



Шэры, злосны, галодны ... .
Рыжая, хітрая, кемлівая ... .
Жоўтае, маленькае, пушыстае ... .
Працавітыя, маленькія, дружныя ... .







Вусна пастаўце пытанні ад назоўнікаў да слоў — назваў прымет прадметаў.



Правообладатель Национальный институт образования

Словы, якія абазначаюць прыметы прадметаў і адказваюць на пытанні **я к і? я к а я? я к о е? я к і я?**, — гэта **прыметнікі.**

**134.** Прачытайце сказы. Прыметнік у дужках пастаўце ў патрэбную форму.

1. Паліна апранула на вуліцу *(цёплы)* куртку. 2. Раніцай прайшоў *(цёплы)* дождж. 3. Бабуля пачаставала ўнукаў *(цёплы)* булачкамі. 4. *(Цёплы)* сонейка высушыла зямлю.

Спішыце адзін сказ на выбар, раскрываючы дужкі. Разбярыце яго па членах сказа. З якім словам у сказе звязаны прыметнік? Якім членам сказа з'яўляецца прыметнік?

Прыметнік у сказе звязваецца з назоўнікам. Ён часцей бывае даданым членам сказа:

я к о е?

***Маленькае кацяня грэлася на сонейку.***

**135.** Прыдумайце сказы, якія адпавядаюць наступнай схеме. Назавіце ў сказах прыметнікі.






Правообладатель Национальный институт образования

**136.** Да назоўнікаў з правага слупка падбярыце прыметнікі з левага слупка.



| | |
|---|---|
| пясчаны<br>пясочны | гадзіннік<br>бераг |
| каме́нная<br>камяністая | дарога<br>вежа |
| лясное<br>лясістае | месца<br>возера |





Дапоўніце сказы спалучэннямі слоў, якія падыходзяць па сэнсе.

1. Мы выйшлі на … … ракі. 2. На ўзгорку стаяла … … . 3. Свіцязь — гэта вялікае … … з чыстай вадой.

**пясча́ны**

Запішыце сказ, у якім ёсць слоўнікавае слова.

**137.** Знайдзіце ў кожнай групе прыметнікаў лішні.

1. Маленькі, дробны, вялікі, невялікі.
2. Шпаркі, павольны, хуткі, быстры.

Дапоўніце сказы словамі першай групы і запішыце.

Пачаўся … дождж. … хлопчык апрануў куртку і выйшаў на вуліцу. Да яго падбег … сабачка.



Правообладатель Национальный институт образования

**138.** Прачытайце. Спішыце першую і другую часткі тэксту. Падкрэсліце прыметнікі. Знайдзіце сярод іх антонімы.

У Андрэйкі ёсць сабака Буян — чорны, як вугаль, і калматы, як баранчык. Смешны і прыгожы.

Ёсць яшчэ кот Андрыян — белы, як вата, і з кароткай поўсцю.

Такія непадобныя адзін да аднаго, а дружбакі — **вадой не разальеш.** *(Паводле І. Муравейкі.)*

Як вы разумееце сэнс выдзеленага выразу?

## Змяненне прыметнікаў па родах

**139.** Апішыце пры дапамозе прыметнікаў *прыгожы*, *вялікі* прадметы на малюнках.







Запішыце спалучэнні слоў, якія атрымаліся. Абазначце канчаткі прыметнікаў.

?! Як вы думаеце, чаму яны змяніліся? Вызначце род і лік назоўнікаў у спалучэннях слоў. Вусна пастаўце пытанні ад назоўнікаў да прыметнікаў.



Правообладатель Национальный институт образования